**Алена Рубель**

**Бібліятэкар
Гродзенскай гарадской
цэнтральнай бібліятэкі
імя А. Макаёнка**

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ Ў МЕМАРЫЯЛЬНЫХ ДОШКАХ ГРОДНА

Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей, падлеткаў і моладзі заўсёды было адной з найважнейшых задач грамадства. Для выхавання годнага грамадзяніна, патрыёта неабходна фарміраваць у падрастаючага пакалення пачуццё адданасці роднай зямлі, павагі да гістарычнага мінулага краіны. У сістэме сацыяльных інстытутаў, якія займаюцца патрыятычным выхаваннем, бібліятэцы адводзіцца важнае месца. Бібліятэкі здольны збіраць і захоўваць інфармацыю аб родным краі і яго людзях, папулярызаваць гэтыя веды, далучаць да іх грамадства, што з'яўляецца важкім фактарам у выхаванні патрыятызму.

Гродна – горад са значнай гісторыка-культурнай спадчынай. У ім маецца больш за 150 аб'ектаў манументальнай скульптуры: помнікаў, помнікаў-бюстаў, мемарыяльных дошак, знакаў, комплексаў, усталяваных у гонар герояў войн, асоб, якія праявілі сябе ў мастацкай творчасці, адукацыі, навуцы і іншых сферах дзейнасці ці ў знакавых для горада і краіны гістарычных падзеях.

З мэтай патрыятычнага выхавання, распаўсюджвання краязнаўчых ведаў сярод насельніцтва ў бібліятэкараў Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Гродна нарадзілася ідэя расказаць пра лёсы людзей, падзеі, якія ўвекавечаны ў помніках, мемарыяльных дошках і знаках.

Збор звестак пра асоб і падзеі, якім прысвечаны аб'екты манументальнай скульптуры ў Гродне, пачалі яшчэ ў 2019 г. Паўсталі пытанні, якія датычыліся храналогіі ўстаноўкі, фактаў біяграфій асоб, геаграфічных і гістарычных звестак. Для адказаў на іх патрэбна было працаваць у музеях і архівах горада. Дапамогу ў пошукавай працы аказвалі ўстановы і прадпрыемствы горада. Пасля карпатлівай даследчай работы быў выдадзены біябібліяграфічны даведнік «Памяць горада Гродна ў манументальнай скульптуры» (асобы і падзеі), створаны электронны інфармацыйны рэсурс (ЭІР) «Манументальная памяць горада Гродна» з наяўнасцю картаграфічнага і фотаматэрыялу (http://centrbibl.grodno.by/).



Экскурсія «Мемарыяльны Гродна»




Экскурсія «Дарогай памяці»

У 2022 г. на аснове сабраных матэрыялаў гродзенскія бібліятэкары паспяхова рэалізавалі маштабны краязнаўчы экскурсійны праект «Гістарычныя падзеі ў мемарыяльных дошках Гродна». Сваю працу яны прысвяцілі Году гістарычнай памяці ў Рэспубліцы Беларусь. У межах экскурсійнага праекта арганізавалі 30 экскурсій па горадзе і яго ваколіцах. Сярод іх – 10 інклюзіўных гістарычных вандровак і 20 краязнаўчых экскурсій для навучэнцаў школ, гімназій, каледжаў і студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі.

Для людзей з парушэннямі зроку ладзілі інклюзіўныя экскурсіі «Ад Фары Вітаўта да Замкаў». Экскурсанты пабывалі каля памятнага знака Фары Вітаўта, мемарыяльнай дошкі ахвярам Гродзенскага гета № 1, Музея гісторыі рэлігіі, помніка Давыду Гарадзенскаму, каля скульптуры князя Вітаўта побач з Новым і Старым замкамі Гродна. Ацаніць памеры і абрысы будынкаў і помнікаў дапамаглі тактыльныя ілюстрацыі, зробленыя загадзя бібліятэкарам спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку.

Для людзей з ментальнымі асаблівасцямі адбылася экскурсія «Час выбраў іх!». У скверы каля помніка памяці воінам-афганцам удзельнікі даведаліся пра салдат, якія загінулі ў час ваенных дзеянняў на тэрыторыі Афганістана ў 1980-я гг. Падчас экскурсіі была аб’яўлена хвіліна маўчання. Да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў арганізавалі экскурсію «Абавязаны памятаць». Ля ўвахода ў былое Гродзенскае гета № 1 пабачылі мемарыяльную дошку ў памяць аб яўрэях Гродна, забітых нацыстамі. Каля Вялікай харальнай сінагогі даведаліся аб трагедыі яўрэяў Гродна і ваколіц у 1941–1943 гг. Падчас экскурсіі «Дарогай памяці», прымеркаванай да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, маладыя людзі пабывалі ў гісторыка-культурным турыстычным комплексе «Гродзенская крэпасць. Партызанскі лагер» (в. Каробчыцы, Гродзенскі раён). На тэрыторыі комплексу экскурсанты ўбачылі партызанскія зямлянкі, шалашы, лясную школу і ваенную тэхніку. З дапамогай інфармацыйных дошак пазнаёміліся са звесткамі пра ўдзельнікаў падпольнай барацьбы ў Гродне. Маршрут экскурсіі «Памяць, высечаная ў камені» пралягаў па цэнтральных вуліцах горада. Вандроўка пачалася каля помніка воінам-вызваліцелям на Савецкай плошчы. На вул. Замкавай ля мемарыяльнай дошкі маладыя людзі ўшанавалі памяць ахвяр Халакосту. Аб жыцці і дзейнасці маршала Савецкага Саюза В.Д. Сакалоўскага даведаліся каля помніка-бюста на вул. Савецкай. У гарадскім парку імя Ж.Э. Жылібера каля манумента воінам і партызанам успомнілі імёны загінуўшых і пахаваных тут ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

Для школьнікаў і гімназістаў ладзілі маштабную экскурсію «Мемарыяльнае Гродна», прысвечаную дошкам і помнікам дзеячам культуры і літаратуры, якія жылі і працавалі ў Гродне ў XIX – пачатку XX ст. Гэта А. Карпюк, І. Пушкоў, Э. Ажэшка, С. Налкоўская, М. Багдановіч, Р. Шырма, А. Міцкевіч, Янка Купала. Удзельнікі паслухалі аповеды каля скульптурных аб’ектаў аб тым, які след гэтыя асобы пакінулі ў гісторыі Гродна, аб развіцці горада ў кантэксце гісторыі Беларусі.

Дзеці і падлеткі пабывалі на экскурсіі «Спадчына Яна Каханоўскага» ля ме-



марыяльнай дошкі Яну Каханоўскаму на будынку Гродзенскага заалагічнага парка, паслухалі інфармацыю аб жыцці і падзвіжніцкай дзейнасці стваральніка заапарка Каханоўскага, яго гібелі. Падчас экскурсіі «Наш зямляк – генерал Антонаў» каля помніка-бюста ўраджэнцу Гродна Аляксея Антонава школьнікаў пазнаёмілі з біяграфіяй военачальніка, распрацоўшчыка вырашальных аперацый у час Вялікай Айчыннай вайны. На экскурсіі «Імя героя. Вольга Соламава» ля помніка падпольшчыцы бібліятэкары расказалі аб барацьбе В. Соламавай супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пра подзвіг удзельніка вызвалення Гродзеншчыны Агадзіла Сухамбаева дзеці і падлеткі даведаліся падчас экскурсіі «Памятаем імя тваё». Біяграфію старшага лейтэнанта, начальніка 4-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада Феадосія Кірычэнкі нагадалі на экскурсіі «Ён абараняў Радзіму». Кранальнай была экскурсія «Калі б камяні маглі гаварыць» у скверы памяці воінаў-афганцаў. Бібліятэкары расказалі дзецям і падлеткам аб адкрыцці помніка ў памяць аб загінуўшых у Афганскай вайне гродзенцах. Потым іх правялі да памятнай дошкі В.Э. Бараноўскаму і А.І. Піскуну, выпускнікам Тэхналагічнага каледжа Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане.

Навучэнцы Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа сталі ўдзельнікамі экскурсіі «Імя, вартае нашай памяці» да бюста генерал-маёра Л.М. Даватара. Бібліятэкары расказалі пра мужнасць і гераізм Льва Даватара, нагадалі пра важнасць гістарычнай памяці. Прысутныя ўшанавалі памяць загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне хвілінай маўчання, усклалі кветкі да помніка. Для навучэнцаў Гродзенскага дзяржаўнага электратэхнічнага каледжа імя І. Шчаснага арганізавалі экскурсію «Горад, у якім я жыву». Экскурсанты пазнаёміліся з гісторыяй Гродна: даведаліся пра першыя паселішчы, атрыманне магдэбургскага права, статус абласнога цэнтра Беларусі. Прайшліся па Савецкай плошчы, даведаліся пра мемарыяльныя знакі, якія размешчаны ў гістарычным цэнтры горада. Для студэнтаў філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы правялі экскурсію «Памяць Гродна. Эліза Ажэшка». Месцам сустрэчы стаў дом-музей Э. Ажэшкі. Маладыя людзі таксама пабывалі ля помніка Элізе Ажэшцы на вуліцы, якая носіць імя пісьменніцы.

У межах краязнаўчага экскурсійнага праекта «Гістарычныя падзеі ў мемарыяльных дошках Гродна» больш за 700 дзяцей, падлеткаў і моладзі пазнаёміліся з аб'ектамі манументальнай скульптуры ў Гродне, даведаліся пра лёсы і подзвігі ўганараваных людзей, пра падзеі, якія ўвекавечаны. Бібліятэкі, дзякуючы рэалізацыі краязнаўчага экскурсійнага праекта, спрыялі патрыятычнаму выхаванню грамадства, зрабілі значны ўнёсак у рэалізацыю рэспубліканскіх мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года гістарычнай памяці ў Рэспубліцы Беларусь.

Summary

The article presents the excursion local history activities of the Centralized Library System of the city of Grodno.